15 чэрвеня 2017 года, № 8 (1196)

# ДЭМАНСТРУЕМ МАЙСТЭРСТВА Ў ФЕСТЫВАЛЬНЫМ ФАРМАЦЕ

У маі наша alma mater гасцінна расчыніла дзверы перад удзельнікамі II Беларуска-італьянскага фестывалю псіхалагічнага майстэрства, які арганізавалі БДПУ і Фларэнтыйскі дзяржаўны ўніверсітэт пры ўдзеле Універсітэта Кальяры (Італія).



З прывітальным словам да ўдзельнікаў мерапрыемства звярнуліся прарэктар БДПУ па навуковай рабоце Г. В. Торхава, дырэктар ІПКіП І. У. Шасцітка, дырэктар Інстытута псіхалогіі Д. Р. Дзьякаў, а таксама асістэнт рэктара Універсітэта Кальяры па арганізацыі інклюзіўнай адукацыі Данатэла Рыта Пятрэта. Госця прачытала для прысутных лекцыю «Гісторыя даследаванняў інтэлекту і праблемы інклюзіі ў школе і ўніверсітэце», а пасля правяла майстаркласс «Даследаванні інтэлекту ў розных клінічных умовах».

Н. А. Цыркун, член Праўлення Беларускага рэспубліканскага таварыства псіхолагаў, прадставіла майстар-клас «Дом без гвалту», падчас якога прысутныя даследавалі ўласнае стаўленне да праблемы, асвойвалі спосабы першаснай прафілактыкі. Майстар-клас кіраўніка трэнінгавай кампаніі «Партнёр», заснавальніка сацыяльна-асветніцкай установы «Сямейны цэнтр» Кірыла Будкевіча быў прысвечаны прафесійнай мабільнасці як інструменту паспяховай кар’еры. Яго ўдзельнікі знаходзілі адказы на пытанні, звязаныя з прафесійнай арыентаванасцю, абмяркоўвалі стратэгіі мадэлявання сваёй будучыні і інш.

Даведацца пра найбольш эфектыўныя метады пераадолення залежнасцей (хімічнай, эмацыйнай, іншых) прысутныя змаглі на майстаркласе псіхолага Прадстаўніцтва нідэрландскай Асацыяцыі «Урачы без межаў» гештальт-практыка Дзмітрыя Чарнышэвіча.

Азнаёміцца з адным з самых папулярных за мяжой спосабаў лячэння і прадухілення дэпрэсіі – кагнітыўна-паводніцкай тэрапіяй – удзельнікі фестывалю атрымалі магчымасць падчас майстар-класа дырэктара Інстытута псіхалогіі БДПУ Д. Р. Дзьякава. Дзмітрый Рыгоравіч прадэманстраваў адну з тэхнік аказання псіхалагічнай дапамогі.

Аўтары майстар-класа «Што ў доміку маім: тэхнікі работы з сямейнай сістэмай» – псіхолагі, сямейныя тэрапеўты, выкладчыкі ФСПТ БДПУ Ірына Жураўкіна і Таццяна Кяцко далі прысутным магчымасць знайсці эфектыўныя метады работы на прыкладзе ўласных сем’яў.

На адным дыханні прайшоў майстар-клас псіхааналітыка Элы Раманавай. Сваім майстэрствам і мастацтвам валодання метафарычнымі картамі падзялілася практыкуючы жаночы псіхолаг Ганна Свет. Удзельнікі майстар-класа атрымалі інструменты стварэння сваіх асабістых метафар для вырашэння любых задач, якія датычаць жыцця, бізнесу, стасункаў, здароўя і г. д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У другі дзень фестывалю да яго ўдзельнікаў звярнуліся прадстаўнікі Фларэнтыйскага дзяржаўнага ўніверсітэта – намеснік дырэктара Дэпартамента псіхалогіі і педагогікі прафесар Патрыцыя Мярынгала і кіраўнік Цэнтра стратэгічнай кароткатэрміновай тэрапіі Мойра К'ёдзіні. Пазней прысутныя наведалі Беларуска-італьянскі адукацыйны цэнтр і пакінулі свае запісы ў Кнізе ганаровых гасцей.

Патрыцыя Мярынгала прачытала лекцыю «Метадалогія і метады фарміравання жыццястойкасці», з якой вынікала, што псіхалагічная ўстойлівасць – гэта працэс фарміравання новых мэт і веры ў сябе, што неабходна для пераадолення крызіснай сітуацыі. Прафесар правяла майстар-клас па мадэляванні псіхічнага стану і паводзін чалавека, які апынуўся ў крызіснай сітуацыі, азнаёміла з практыкай фарміравання жыццястойкасці.

Як навучыцца своечасова распазнаваць і ўмела прадухіляць пагрозу псіхалагічнага ўздзеяння з боку навакольных і расстаўляць пасткі для актыўных маніпулятараў? Адказы на гэтыя пытанні ўдзельнікі фестывалю пастараліся знайсці на майстар-класе дацэнта кафедры дадатковай педагагічнай адукацыі ІПКіП БДПУ Г. В. Гатальскай.

Унікальны генетычны код кожнага чалавека мае сваё адлюстраванне ў абліччы – лініі броваў, разрэзе вачэй, форме носа і рота – і прадвызначае асноўныя мадэлі нашых паводзін. Удзельнікі майстар-класа «Фізіянамічныя ключы дасягненняў і поспеху ў жыцці», які правяла кандыдат медыцынскіх навук, вядучы навуковы супрацоўнік Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя Інэса Грыгор'ева, вывучалі ўласныя фізіянамічныя рысы для пошуку прыроджанага патэнцыялу, а таксама знаёміліся з тэхнікамі іх інтэрпрэтацыі. Аўтар майстар-класа ўпэўнена, што, калі мы жывем у згодзе са сваёй сапраўднай прыродай, навакольныя ўспрымаюць нас надзвычай прывабнымі.

Падчас майстар-класа «Грошы ў вашым жыцці: утоеныя пасланні», які праводзіла член Беларускай асацыяцыі псіхатэрапеўтаў Вольга Ісаева, прысутныя атрымалі магчымасць усвядоміць унутраныя ўстаноўкі, што ўплываюць на іх фінансавы дабрабыт.

У другой палове дня лекцыю аб стратэгіі ў пераадоленні крытычных сітуацый і майстар-клас па развіцці жыццястойкасці ўдзельнікам фестывалю прадставіла Мойра К'ёдзіні. Прысутныя здолелі пераканацца, што дзякуючы стрэсам мы развіваемся, а яшчэ азнаёміліся з тэхнікамі тэрапіі для пераадолення крытычных сітуацый.

На майстар-класе загадчыка лабараторыі клінічнай псіхалогіі і псіхалагічнага кансультавання Інстытута псіхалогіі БДПУ І. А. Громавай прысутныя вучыліся разумець такую з'яву, як сон. Старшы выкладчык Гомельскага абласнога інстытута развіцця адукацыі І. В. Сцішанок прадаставіла магчымасць кожнаму ацаніць казку як эфектыўны псіхалагічны метад інтэграцыі асобы і яе ўзаемадзеяння з навакольным светам.

Удзельнікі майстар-класа пад кіраўніцтвам урача першай кваліфікацыйнай катэгорыі Вольгі Бялькевіч мелі магчымасць адчуць на практыцы ўздзеянне саматычнага падыходу – метаду, які дазваляе расслабіцца і палепшыць настрой.

*Завяршыўся фестываль абменам думкамі, пажаданнямі пашырэння сфер супрацоўніцтва паміж універсітэтамі, падзякамі арганізатарам за гасціннасць, высокі навуковы ўзровень лекцый і майстар-класаў.*

Юлія КАЛЯГА, кіраўнік Беларуска-італьянскага адукацыйнага цэнтра, старшы выкладчык ІПКіП

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ